# Васьмёра нежанатых, і кожны [redacted] "цар"!



**У кастрычніку 2009 года абрад "Калядныя цары" рашэннем сакратарыята чацвёртай сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны быў уключаны ў Спіс тэрміновай аховы аддзела нематэрыяльнай культурнай спадчыны** UNESCO. **Абрадавы калектыў "Цары", ўганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, дзейнічае пры Семежаўскім цэнтры культуры і вольнага часу**.

Як кажа "К" начальнік аддзела культуры Капыльскага райвыканкама Наталля Царкова, ініцыятарамі адраджэння "Цароў" і прыцягнення да іх сусветнай увагі аалі Семежаўскі сельсавет, мясцовыя жыхары, упраўленне культуры Мінскага аблвыканкама і аддзел культуры Капыльскага райвыканкама.

Кіраўнік абрадавага калектыву — дырэктар Семежаўскай клубнай установы Таццяна Шаура. Яна — мясцовая, працуе тут пасля заканчэння Інстытута культуры аж з 1985 года.

## Спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва

Абрад "Калядныя цары" ладзіцца ў вёсцы штогод на Шчодры вечар — 13 студзеня. Сярод васьмі калядоўшчыкаў — маладыя, высокія, нежанатыя хлопцы-прыгажуны, словам — "цары". Дарэчы, сярод іх няма ніводнага штатнага культработніка. Гэта ў асноўным — студэнты і рабочыя мясцовага СВК. Апрача хлопцаў у калядңай дзеі бяруць удзел Гарманіст, Дзед ды Баба, Механоша... Залішне казаць, што "Цары" ў сучасным выкананні захоўваюць выхаваўчую, сацыялізуючую, эстэтычную, камунікатыўную функцыі, а таксама з'яўляюцца пераканаўчым узорам ашчаднага стаўлення да святочнай абрадавай традыцыі.

Па словах Наталлі Царковай, цягам мінулага года было прадоўжана далейшае вывучэнне абраду, а ў працэс ягонай пераемнасці пастаянна ўцягваюцца ўсё новыя людзі.

**А.С.**

**На здымку: капыльскія "Цары".**

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ